УДК 356.15"1941/1945"

Навуч. А.М. Стахоўскі
Навук. кір. Л.А. Чарэнка, настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі
(ДУА "Карабоўская дзіцячы сад-сярэдняя школа
Глыбоцкага раёна імя Р.І. Мацеюна")

# ПАРТЫЗАНСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЧАСОЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў РОДНЫМ КРАІ

75 год прайшло з дня заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Але і да гэтага часу пякучым болем адзываецца найцяжэйшая з войнаў у сэрцы кожнага чалавека. Не трэба і перажываць тыя падзеі, каб ведаць, што гэта – гора, страты, смерць. Мы не павінны забываць пра жахі і пакуты мільёнаў людзей. Помніць аб вайне, гераізме і мужнасці тых, хто змагаўся з ворагам і вызваляў ад фашысцкага нашэсця Радзіму, – гэта значыць, змагацца за мір. Гэта абавязак усіх, хто жыве на зямлі.

Няма ў нашым раёне ніводнай вёсачкі, дзе б не пакінула свой чорны след вайна. Таму і высяцца сярод азёр і пагоркаў абеліскі. Горкая памяць тых незабыўных дзён – 46 ваенных помнікаў на Глыбоччыне і за кожным з іх – свая гісторыя, свой боль, свая трагедыя.[2, с.2]

Мэта пошукава-даследчай працы: вызначэнне ролі партызан-землякоў ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Задачы:

- даследаваць жыццё, працу, барацьбу жыхароў карабоўскай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны;
- акрэсліць партызанскую дзейнасць брыгады імя Варашылава;
- правесці сустрэчы з мясцовымі жыхарамі, якія мелі дачыненне да падзей Вялікай Айчыннай вайны ў родным краі;
- наведаць Глыбоцкі занальны архіў;
- арганізаваць пошук і збор звестак, дакументаў, экспанатаў, звязаных з асноўнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны;
- аформіць сабраны матэрыял.

Метады**:**

- гістарычны пошук неабходных матэрыялаў;
- гутаркі з мясцовымі жыхарамі аб жыцці і барацьбе землякоў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, вызваленні роднага краю;
- вывучэнне ўспамінаў сведак ваенных падзей;

- ранжыраванне прадстаўленняў і меркаванняў дзяцей, моладзі, людзей працоўнага, пенсійнага ўзростаў аб мінулым часе Вялікай Айчыннай вайны ў родным краі;
- аналіз, сінтэз атрыманых даных.

Гіпотэза: калі маюцца гістарычныя факты і доказы партызанскай, падпольнай, дыверсійнай дзейнасці землякоў, то яны з'яўляліся актыўнымі барацьбітамі за вызваленне роднага краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Прагназуемы вынік: падзеі з жыцця землякоў, дакументы і ўспаміны сведак часоў Вялікай Айчыннай вайны даказваюць, што партызаны і многія жыхары вялі актыўную дзейнасць у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі роднага краю.

Сярод малодшых школьнікаў, вучняў сярэдняга звяна і старэйшых класаў у пачатку працы было праведзена апытанне наконт ведання імі, іх бацькамі і знаёмымі падзей Вялікай Айчыннай вайны ў родным краі. Вучні малодшых класаў амаль не ведалі адказаў на пытанні, акрамя Дзён Вялікай Перамогі і Вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, не змаглі паведаміць цікавыя звесткі з гісторыі жыцця продкаў на Карабоўскай зямлі.

Дзесьці палова вучняў сярэдняга звяна штосьці ведала пра некаторыя подзвігі землякоў, партызан, барацьбітоў.

Вучні старэйшых класаў мелі больш прадстаўленняў пра ваенныя падзеі ў Беларусі, на Глыбоччыне і на Карабоўскай зямлі, але на многія цікавыя пытанні не маглі адказаць.

Па заканчэнні працы сітуацыя змянілася: пазнаёміцца з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны ў родным краі было ўсім цікава і выказалі думку, што карысна.

У 1941 годзе жыхары вёскі Канстанцінава з жахам слухалі зводку пра пачатак вайны. У Канстанцінаве, як і ўсюды, пачалі ўсталёўвацца новыя парадкі, там размясціўся нямецкі гарнізон. Маўчаць мёртвыя ліпы, пахаваўшы з сабой адну з трагедый Вялікай Айчыннай вайны. Але ці павінна маўчаць людская памяць? Калі пачалася вайна, Яўгеніі Канапелька было дзевятнаццаць гадоў. Над Гулідавам, яе роднай вёсачкай, навісла туга і трывога.

Рабочыя чыгункі "Канстанцінава – Круляўшчызна" успаміналі, што Жэня Канапелька была вельмі прыгожай, апраналася як немка, на чорных работах не працавала. Мясцовыя жыхары асуджалі яе паводзіны.

Напрыканцы 70-ых гадоў Пятру Станіслававічу Раловічу надарылася мець гаворку з сястрой Жэні. Тады ўпершыню і выказала

пажылая жанчына тое, што насіла ў сваім сэрцы не адзін год: "Усіх увекавечылі на помніку загінуўшым землякам, а для нашай Жэні не знайшлося месца". Гэты папрок балюча запаў у сэрца Пятра Станіслававіча, і ён даў сабе словада капацца да ісціны, тым больш, што даўно шукаў адказ на пытанне: "Кім жа на самай справе была Жэня Канапелька?"

Пачалася настойлівая пошукавая работа. І вось што ўдалося высветліць. У пастаўскіх лясах дзейнічаў партызанскі атрад імя Суворава. Для яго вельмі важнымі былі звесткі з нямецкага гарнізона, які базіраваўся ў Канстанцінаве. Патрэбны былі разведчыкі і сувязныя. Мясцовыя жыхары падказалі камандзіру атрада Анатолю Сударыкаву, што ў Гулідаве і ёсць дзяўчына, якая справіцца з гэтай работай. Сустрэўшыся з Жэняй, Сударыкаў прапанаваў ёй стаць партызанскай сувязной. Нікольки не раздумваючы, яна дала згоду дапамагаць народным мсціўцам.

Былы палітрук атрада "Грозны" брыгады імя Варашылава, жыхар вёскі Ляхаўшчына Мікалай Татун успамінаў, што гэта была вельмі смелая і гордая дзяўчына, калі яна прыходзіла ў атрад, то ўсе ведалі, што Яўгенія прынесла важныя звесткі.[3, 4]

Каб дабыць гэтыя звесткі, Жэня пайшла працаваць да немцаў. Там жа служылі два савецкія разведчыкі. Аднаго звалі Сямён, другога – Васіль. Яны працавалі заадно з Жэняй: перадавалі партызанам праз яе звесткі аб руху паяздоў. Пад покрывам ночы Жэня дабіралася ў атрад, каб тэрмінова перадаць важныя паведамленні. А ўранку, вясёлай, прыгожай, без кроплі стомы яна павінна была быць у бункерах, дзе размяшчаўся нямецкі гарнізон. [1, 3]

Жыццё Яўгеніі Кананелькі абарвалася летам 1942 года. Росным ранкам яна вярнулася з партызанскага атрада, пераапранула мокрую сукенку і прылягла адпачыць. Каля 11гадзін у хату ўварваліся паліцаі. Адна з сясцёр, якая была дома, паспела схавацца, а Жэні заламалі рукі, укінулі ў машыну і павезлі, як пазней удалося даведацца родзічам, у глыбоцкую камендатуру.

Калі прыехалі ў турму сёстры, каб забраць цела Жэні і адвезці ў Гулідава, немцы не дазволілі. Яны прымусілі разам з трупамі іншых зняволеных адвезці нябожчыцу ў Барок. Там і знайшла свой апошні прытулак дваццацігадовая Яўгенія Канапелька, партызанская сувязная атрада імя Суворава.

Кароткім было жыццё гэтай маладой дзяўчыны. У росквіце гадоў абарвалася яе юнацтва — самая прыгожая пара. Ніхто не паспагадаў родным, не раздзяліў невыносны боль страты дачкі і сястры. І толькі

праз 42 гады, дзякуючы нястомнаму пошуку мясцовага краязнаўцы П.С.Раловіча, была змыта брудная пляма з яго зямлячкі.

Да вайны каля вёскі Гінькі жыла сям'я Пятра Фаміча Шчаснага. Восьмы дзесятак размяняў гаспадар дома, калі пачалася вайна. У доме, акрамя гаспадароў, жылі малодшы сын Павел, нявестка Ганна і ўнучка Волечка, якая нарадзілася вясной 1942 г. Старэйшы сын Мікола меў сваю хату, жыў недалёка ад бацькоў. З першых дзён акупацыі ён падтрымліваў сувязь з патрыётамі, сярод якіх была і Яўгенія Канапелька. Калі з'явіліся першыя партызаны, яго хата стала своеасаблівым пунктам сувязі народных мсціўцаў. Надзейнымі памочнікамі Мікалая сталі старэйшыя дочкі Галіна і Валянціна, а таксама жонка, брат Павел і бацька.

Трагедыя здарылася ў канцы снежня 1942 г. Неасцярожнасць у паводзінах партызана Сяргея Шашкова, які пасля баявога задання заехаў пераначаваць да Мікалая, наклікала бяду на сям'ю Шчасных. Устрывожаная жонка Мікалая адвяла малалетніх дзяцей Таісу, Тамару і Дзіму на хутар да Пятра Фаміча, а самага маленькага, яшчэ ў пялёнках, занесла да суседзяў. Сама ж з дочкамі Галяй і Валянцінай пайшла да партызан. У гэты час гаспадар сям'і Мікалай Шчасны адсутнічаў.

Па даносе здрадніка на наступны дзень у вёску прыехалі гітлераўцы. Яны не засталі нікога ў доме Мікалая, падпалілі хату і накіраваліся на хутар да Пятра Фаміча. Праз некалькі мінут хата занялася полымем. Калі гітлераўцы пакінулі вёску, людзі кінуліся на пажарышча. Відовішча было страшэннае: аднавяскоўцы ўбачылі сем знявечаных абгарэлых трупаў.

Акрамя дзяцей Мікалая, каты расправіліся з Пятром Фамічом, яго сынам Паўлам, нявесткай Ганнай і іх дачкой Вольгай. Бліз месца трагедыі аднавяскоўцы і захавалі знішчаную сям'ю. Такой дарагой цаной заплаціла сям'я Шчасных за дапамогу людзям, якія змагаліся з ворагамі. Мікалай ваяваў у атрадзе "Грозны", як і яго дочкі Галя і Валя атрымаў баявыя ўзнагароды. [5, 128]

У 1981 годзе на месцы захаванняў пад кіраўніцтвам адміністрацыі калгаса "XXII партз'езд" і мясцовага краязнаўцы Раловіча Пятра Станіслававіча быў ўстаноўлены помнік. У Дзень Перамогі да помніка на мітынг сабраліся родныя загінуўшых, ветэраны, школьнікі, усе ўдзячныя землякі. У памяць аб той трагедыі было сказана шмат слоў смутку, жалю.

Подзвіг савецкіх змагароў будзе заўсёды жыць у сэрцах удзячных нашчадкаў! Памяць наша: у дапамозе ветэранам, дзецям вайны, іх сем'ям, у наладжванні свят, звязаных з Вялікай Перамогай, з Днём Вызвалення, у даглядзе помнікаў ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, у

знаёмстве з літаратурай, успамінамі, прысвечанамі тым жахлівым падзеям!

Па выніках праведзенай працы можна зрабіць наступныя вывады:

- увесь савецкі народ, у тым ліку і нашы землякі перажылі вельмі цяжкія часы ваеннага ліхалецця;
- барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі насіла жорсткі характар;
- умовы партызанскай барацьбы былі жудаснымі і сакрэтнымі;
- акружаючыя людзі не ведалі ў сапраўднасці, хто меў дачыненне да партызанкай барацьбы, менавіта, пра лёс Яўгеніі Канапелька;
- Карабоўскі краязнавец П.С. Раловіч у ходзе пошукава-даследчай дзейнасці сабраў матэрыял, які падцвердзіў удзел Яўгеніі Канапелька ў партызанскай барацьбе з варожымі акупантамі;
- памяць пра адважных змагароў, партызан, сувязных будзе жыць у сэрцах удзячных нашчадкаў!

З праведзенай пошукава-даследчай працай былі пазнаёмлены вучні школы, іх бацькі, настаўнікі ў рамках мерапрыемстваў тыдня краязнаўства. Увогуле, вучні і дарослыя ведаюць пра партызанскую дзейнасць часоў Вялікай Айчыннай вайны ў родным краі, яны з'яўляюцца носьбітамі багатай гістарычнай спадчыны, якая аказвае станоўчы ўплыў на менталітэт сучасных беларусаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Бародзіч, У.А. Успаміны/ У.А.Бародзіч// Кабінет гісторыі ДУА . – 2007.-20 лістапада.-5 с.

2. Марцынкевіч, Р. Мы перамаглі//Р. Марцынкевіч // Веснік Глыбоччыны. - 2007. – 14 сакавіка. – с.3.

3. Раловіч, П.С. Успаміны/ П. С. Раловіч // Кабінет гісторыі ДУА . – 2004.- 11 кастрычніка . -10 с.

4. Раяк, М.Г. Чёрные дни войны, Минск "Беларусь", 1991. – с. 96

5. Сачанка, Б.І., Курловіч, М.М., Малашэвіч, Я.В. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна //Мінск: "Беларускаяэнцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1995. – 451 с.